## Аб спыненні эпідэміі
### (перадапошні заклік)

Молімся за ўсё чалавецтва,
якое церпіць з прычыны пашырэння эпідэміі,
за ўсіх бездапаможных і разгубленых,
за хворых і за тых, хто аддана ім служыць,
а таксама за памерлых.




Малітва ў маўчанні. Затым святар працягвае:

Усемагутны вечны Божа,
глянь ласкава на змучанае чалавецтва,
якое шукае ў Цябе пратунку; †
стрымай пашырэнне страшнай хваробы і смерці, *
каб зноў усе змаглі радавацца дарам Тваёй ласкі.
Праз Хрыста, Пана нашага.
Н.: Амэн.